Харавое мастацтва — адно з самых даўнейшых. Яно надзвычай дэмакратычнае, бо не патрабуе наяўнасці музычных інструментаў. І падыходзіць нават самым вялікім баязліўцам: не абавязкова ж спяваць сола. Жартуюць, што яно можа прынесці поспех і тым, хто не мае ні слыху, ні голасу: маўляў, трэба толькі словы вывучыць і ў патрэбныя моманты спраўна адкрываць рот. Дык чаму ж яно не развіваецца ў нас належным чынам? Чаму такая жудасная прорва паміж высокім майстэрствам прафесійных калектываў, шырока прызнаных у замежжы, і масавымі спеўнымі традыцыямі, што размыліся да ўзроўню знікнення?

Шмат гадоў і нават дзесяцігоддзяў беларускія дзеячы культуры ды аматары марылі, каб у нас гэтак жа, як у Прыбалтыцы, было сваё "Спеўнае поле" — стадыён ці іншая даволі вялікая прастора, дзе могуць збірацца шматлікія харавыя калектывы краіны і ўсе ахвотныя, каб спяваць разам — адзіным магутным хорам усёй Беларусі. Захады па ўвасабленні такой ідэі рабіліся, і неаднойчы. Здавалася, вось яшчэ крыху — і... Чарговыя рэформы, праведзеныя ў сістэме адукацыі, выклікалі занепакоенасць. У некалькі заходаў былі скасаваны адладжаныя, здавалася б, прынцыпы агульнай музычнай падрыхтоўкі. Калі ў школах "з ухілам" заняткі хорам былі абавязковымі, дык цяпер іх сталі пераводзіць у форму факультатываў, да таго ж, платных. Знікла прэстыжнасць: яшчэ і насміхацца могуць з таго, хто прагне спяваць не эстрадныя песні сола ці ў гурце, а харавую музыку розных напрамкаў.

Пра ўсё гэта і многае іншае вялася размова на "круглым стале", дзе прысутнічалі дзеячы харавога мастацтва розных узроўняў. У абмеркаваннях узялі ўдзел Валерый АЎРАМЕНКА, прафесар, дэкан вакальна-харавога факультэта Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі; Алена ІСАЙКІНА, кіраўнік народнай харавой капэлы БНТУ; Алена ЛАЦАПНЁВА, кіраўнік Дзіцяча-юначага ўзорнага хору "Ліра" мінскай СШ № 66; Таццяна МАРОЗАВА, намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце СШ № 133 г. Мінска; Альбіна ПЯКУЦЬКА, прафесар, загадчык кафедры харавога і вакальнага мастацтва Беларускага дзяжаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў; Вольга СЛАБОДЧЫКАВА, кіраўнік хору "Санорэ" сталічнай СШ № 133; Тамара СЛАБОДЧЫКАВА, дацэнт Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, кіраўнік харавой капэлы "Акадэмія" Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі; Аляксей СНІТКО, намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце, кіраўнік хору "Concertino" Дзяржаўнага музычнага каледжа імя М.І. Глінкі, кіраўнік хору "Тоніка" Дзіцячай музычнай школы мастацтваў № 1 г. Мінска; Яўген ЯФІМАЎ, саліст харавой капэлы "Акадэмія" НАН Беларусі.

Традыцыі размыліся да ўзроўню знікнення?

Яўген Яфімаў.

Алена Лацапнёва.

Тамара Слабодчыкава.

Аляксей Снітко.

Вольга Слабодчыкава.

Алена Ісайкіна.

Наталля Каралёва.

Альбіна Пякуцька.

Таццяна Марозава.

Валерый Аўраменка.

Тамара СЛАБОДЧЫКАВА:

— Ужо склаўся стэрэатып, што як збяруцца творчыя асобы на "круглы стол", дык адразу пачынаюць "з вуглоў", маўляў, чаго дзе няма. Таму пачаць хацелася б з пазітыву. І — са слоў падзякі. Яшчэ пяць гадоў таму ў адміністрацыі сталічнага Першамайскага райвыканкама нарадзілася ідэя правесці харавое свята. Насамрэч, такія думкі даўно луналі ў паветры (і ў галовах саміх харавікоў). Але тут яны, нарэшце, аформіліся ў штосьці абсалютна магчымае, што набыло рысы рэальнасці, а не аддаленай мары. Было вырашана звесці харавыя калектывы разам і вывесці іх на вуліцу, каб сабраць як мага больш шырокую слухацкую аўдыторыю. Многіх мінакоў прыцягвала ўжо адно тое, што хоры спявалі ў цэнтры горада, на прыступках Акадэміі навук, і здалёк іх было бачна ўсім, хто праходзіў ці праязджаў. Як жа не зацікавіцца такой небывалай дзеяй! Да нас падыходзілі, пыталіся, ці можна паспяваць разам з намі: мы ж імкнуліся, каб у рэпертуары былі папулярныя нумары...

Праз два гады прайшло другое такое свята — каля Нацыянальнай бібліятэкі. Сёлета ж, на Дзень горада, адбылося трэцяе "Спеўнае поле". Надвор'е, калі памятаеце, было не самае лепшае. Але ж як свяціліся твары! Сабралася каля 1 200 чалавек, 37 харавых калектываў. Прыйшоў знакаміты кампазітар, народны артыст СССР Ігар Лучанок, які сам акампаніраваў на раялі свае песні. Тэлебачанне, на жаль, намі не зацікавілася, хаця сам Дзень горада асвятляўся даволі падрабязна. Можа, надта многа мерапрыемстваў было, і на ўсе не паспелі? Але розгалас — быў. Мы пачулі шмат слоў падзякі ад простых людзей, якія былі шчаслівыя далучыцца да "зводнага хору". Магу толькі ўявіць, колькіх намаганняў патрабаваў ад супрацоўнікаў аддзела культуры арганізацыйны працэс, але ўсё было здзейснена: і раяль прывезлі, і харавыя станкі. А як сур'ёзна паставіліся да гэтага ўсе ўдзельнікі! Калектывы ж былі не толькі з Мінска. Магу засведчыць, што ў той жа Прыбалтыцы кожнае такое свята рыхтуецца па два-чатыры гады. Калі ж улічваць іх нацыянальныя традыцыі, дык, можна сказаць, яны рыхталіся да гэтага стагоддзямі. А ў нас усё яшчэ толькі пачынаецца. І важна падтрымліваць кожны парастак...

Валерый АЎРАМЕНКА:

— Харавыя спевы — гэта тое рэчышча, па якім вышываецца ўся культурная спадчына, тая цаглінка, без якой не вытрывае сам будынак нацыянальнай культуры. А не будзе культуры — штосьці парушыцца і ў эканоміцы, палітыцы, ідэалогіі. Бо культура — у яе самым шырокім сэнсе — аснова ўсяго. І пачынаць трэба, вядома, з дзяцей. У школе ж спевы зведзены да мінімуму. Сёння ўрокі музыкі ёсць у раскладзе толькі да чацвёртага класа. Вось і атрымліваецца, што ў рэспубліцы — 40 ВНУ, а хароў там — усяго пяць. Тая ж карціна — у сярэдніх навучальных установах. Адкуль там узяцца навучэнцам, якія прагнуць спяваць, калі любоў да спеваў ім не прывілі ў школьным узросце?..

Таццяна МАРОЗАВА:

— Яшчэ некалькі гадоў таму было прэстыжна аддаваць дзяцей у харавыя школы ды класы. Сёння такая зацікаўленасць дзяцей і, галоўнае, іхніх бацькоў знікае. І тут трэба разумець, што харавыя класы самі па сабе не патрэбны, калі няма хору, — заняткі павінны мець выхад "на сцэну". Але калі хор не ўключаны ў вучэбныя планы, сабраць яго цяжка...

Тамара СЛАБОДЧЫКАВА:

— Як заўважаюць этнографы, якія штогод ездзяць у фальклорныя экспедыцыі, вёска сёння таксама перастала спяваць. У свой час былі падрэзаны карані сельскіх спеваў: з аднаго боку, царкоўныя традыцыі, з іншага — фальклорна-абрадавыя, якія і трымалі спеўную культуру шырокіх мас на высокім узроўні.

Альбіна ПЯКУЦЬКА:

— Сёння духоўныя павевы пачалі адраджацца, але прайшло яшчэ надта мала часу, каб яны зноў паўплывалі на масавае распаўсюджанне харавых спеваў...

Яўген ЯФІМАЎ:

— З навуковага пункта гледжання, любая з'ява ў той ці іншай меры абапіраецца яшчэ і на аб'ектыўныя прычыны, у дадзеным выпадку, хутчэй, сацыяльнага характару. Пра іх ужо пачалі гаварыць. Але хацелася б пачуць думкі спецыялістаў: можа, такі спад грамадскай увагі да хору — нейкая агульная тэндэнцыя, якая ахапіла не толькі нашу краіну? Бо тыя ж сольныя спевы, няхай і эстрадныя, — "праекцыя" індывідуалізацыі асобы. А хор — сімвал калектыўнасці. Таму відавочна, што ў пэўныя перыяды на першы план будзе выходзіць тое, што больш стасуецца з грамадскай псіхалогіяй.

Альбіна ПЯКУЦЬКА:

— Наўрад ці нашы праблемы адпавядаюць сусветным тэндэнцыям. Бо паўсюль, наколькі я ведаю, працягваюць ладзіць грандыёзныя харавыя фестывалі: прага спяваць у людзей не згасла.

Алена ЛАЦАПНЁВА:

— Адчуць прыцягальнасць харавых спеваў часам перашкаджаюць разнастайныя эстрадныя шоу, дзе ўсё атрымліваецца быццам бы лёгка і вельмі хутка: маўляў, раней чалавек зусім не ўнікальны вопыт, якога ў замежжы няма. І мы можам ганарыцца, што яго маем. І не павінны "раскідвацца" тым, што ўжо назапашана. Разбурыць заўсёды прасцей, чым пабудаваць. А падкладаць цаглінкі ў працэсе будоўлі павінен, паўтаруся, кожны, не чакаючы, што хтосьці іншы зробіць гэта за яго.

Яўген ЯФІМАЎ:

— Наколькі я разумею, хоры знаходзяцца ў сферы двух ведамстваў: Міністэрства культуры і Міністэрства адукацыі. Але паміж імі не заўсёды бывае дасягнута паразуменне: кожны зыходзіць са сваіх пазіцый, і атрымліваецца, што часам цягнуць у розныя бакі.

Таццяна МАРОЗАВА:

— Трэба ўлічваць і чалавечую псіхалогію. Часам вельмі шмат залежыць ад сітуацыі на месцах, ад тых кіраўнікоў, якія ўзначальваюць навучальныя ўстановы, прадпрыемствы. Калі чалавек на кіраўніцкай пасадзе ніколі не спяваў сам, ён і іншым не дасць такой магчымасці. І наадварот: калі калектыў бачыць зацікаўленасць свайго кіраўніка, дык і астатнія на гэта раўняюцца.

Яўген ЯФІМАЎ:

— Ды ўсё ж галоўнае, думаю, не ў адукацыі (гэта я па сабе мяркую): спяваць павінна душа — тады і голас "прыкладзецца". У век высокіх тэхналогій мы пачалі надта схіляцца да разнастайных тэхнічных параметраў, надаваць усё большае значэнне дакладным навукам. Але ж гуманітарны складнік, тая "адукацыя душы" павінны быць у кожнага.

Вольга СЛАБОДЧЫКАВА:

— Галоўная задача школы, мяркую, не толькі навучанне (гэта яе больш прыкладная функцыя), але і, абавязкова, выхаванне — як штосьці яшчэ больш грунтоўнае, глабальнае (гэта яе, так бы мовіць, фундаментальная функцыя). І хор у гэтым сэнсе — папраўдзе ідэальны сродак выхавання. Праз яго чалавек і да культурных каштоўнасцей далучаецца, і сацыяльныя якасці развівае, вучыцца кантактаваць са старэйшымі ды малодшымі, дапамагаць ім, зладжана працаваць "у камандзе", што сёння вельмі запатрабавана ва ўсіх сферах дзейнасці.

Тамара СЛАБОДЧЫКАВА:

— Спевы — гэта, як сёння модна казаць, "інтэрактыў". Калі проста на ўроках музыку ўключаюць, дык хтосьці і сапраўды слухае, а хтосьці — "спіць": быццам бы слухае, а сам пра іншае думае. У хоры такое немагчыма. Адпаведна, і вынік — лепшы.

Алена ІСАЙКІНА:

— Ёсць праблемы і ў кадрах хормайстраў. Рыхтуюць іх сапраўды шмат, у некалькіх навучальных установах. Але моладзі, здараецца, хочацца атрымаць усё і адразу, амаль не прыкладаючы для гэтага ніякіх намаганняў. Калі ты ўзначальваеш хор, такога быць не можа. Так, у нас і заробкі не астранамічныя (а Тамара Слабодчыкава, ведаю, узначальвае капэлу Акадэміі навук увогуле на грамадскіх пачатках, без капейкі грошай, — усе трыццаць гадоў). І не ва ўсіх установах кіраўнікі так падтрымліваюць, як, да прыкладу, у нашай. Ёсць праблемы і з самімі ўдзельнікамі калектываў: і з іх колькасцю, і з жаданнем спяваць. Калі я прыйшла ў БНТУ ў 2006 годзе, у хоры было ўсяго шэсць чалавек. Цяпер — сорак. Некаторыя нават збіраюцца змяніць прафесію, каб цалкам прысвяціць сябе музыцы. А ўсё, што я рабіла, — гэта імкнулася, найперш, зацікавіць: рэпертуарам, формай заняткаў, выступленнямі, самой прыцягальнацю творчасці. У гэтым жаданні самога хормайстра — узняць свой калектыў — ніхто ніколі не дапаможа...

Тамара СЛАБОДЧЫКАВА:

— Выпускнікі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі часта сустракаюцца з тым, што яны папросту не патрэбны школам. Кожны год мае выхаванцы "робяць абход" школ ды іншых навучальных устаноў, але амаль нідзе не сустракаюць паразумення. Кіраўнікі не бачаць неабходнасці ў стварэнні аматарскіх харавых калектываў.

Валерый АЎРАМЕНКА:

— Сапраўды, шмат залежыць не толькі ад хормайстра, але і ад кіраўніка прадпрыемства, установы. Я ведаў аднаго старшыню калгаса, які асабіста правяраў, хто прыйшоў на хор, а хто — не. І нават аднойчы паслаў па "прагульшчыка" машыну з сірэнай, каб уся вёска ведала, адкуль сыр-бор загарэўся. Жарты жартамі, а калі хорам цікавіцца "начальства", дык і стаўленне да яго — адпаведнае, а не як да "баўлення вольнага часу": хачу — баўлю, хачу — не.

Вольга СЛАБОДЧЫКАВА:

— Пэўна, трэба больш даводзіць тую выхаваўчую ролю хору, пра якую я казала. Выпускнікі харавых школ неаднойчы прызнаваліся: маўляў, мы — іншыя. Не ў тым сэнсе, што яны неяк супрацьпастаўляюць сябе грамадству. Наадварот! Сярод іх пануе адказнасць, сяброўства, цярплівасць, патрэба дапамагаць, не толькі "браць", але і "аддаваць", — усе гэтыя рысы, па іх уласным прызнанні, выхаваў у іх хор. Гэта і ёсць сапраўднае сацыяльнае выхаванне, якога так, здараецца, бракуе цяперашняму пакаленню. Мы нават сацыяльныя апытанні рабілі. На адно і тое ж пытанне: што даў хор? — адказвалі дзеці і бацькі. Паасобку. Ананімна. Так што ўсё гэта — не пустыя словы.

Алена ЛАЦАПНЁВА:

— У маім калектыве, да прыкладу, — удзельнікі ад 10-і гадоў да 24-х. Чаму, спытаеце, такая разбежка ва ўзросце? Таму, што прыходзяць і былыя выхаванцы. І адразу ўзнікае своеасаблівая "мадэль грамадства", у якой старэйшыя дапамагаюць малодшым, апякуюць іх, навучаюць таму, што ведаюць самі, а малодшыя, у сваю чаргу, бяруць прыклад са старэйшых. І, да ўсяго, развіваюць у іх бацькоўскія якасці, якія спатрэбяцца ўдвая, калі ў тых народзяцца свае дзеці. Канешне ж, у такім калектыве ёсць і мінусы: гэта пастаянная змена складу. Бо хтосьці ўтварае ўласную сям'ю, узнікаюць іншыя клопаты, увесь час прыходзяць дзеці, — штораз трэба ўсё пачынаць з нуля. Але справа таго вартая.

Яўген ЯФІМАЎ:

— Я вось яшчэ што думаю. Сёння мы так шмат часу праводзім за камп'ютарам, што трэба час ад часу вяртацца да нармальных чалавечых стасункаў, пакуль такая патрэба яшчэ ўвогуле не знікла. І замест проста хору павінна быць нешта накшталт гэткага "харавога клуба", дзе людзі збіраліся б не толькі для таго, каб рэпеціраваць, але і каб адпачываць, адзначаць святы, праводзіць музычныя вечары з запрашэннем блізкіх і сяброў. Чаму б і не?

Алена ІСАЙКІНА:

— А самі харавыя выступленні, калі дазваляе рэпертуар, могуць утрымліваць элементы сцэнаграфіі, тэатралізаванай дзеі — усяго таго, што будзе прывабліваць і самых удзельнікаў, і слухачоў. У некаторых творах, асабліва — сучасных аўтараў (той жа Вольгі Вараб'ёвай, чыю музыку мы з задавальненнем спяваем), рухі так і просяцца. Але, вядома, ва ўсім павінна быць мера. І густ. Бо галоўнае — зачароўваць павінны самі спевы. А яшчэ вялікім стымулам заўсёды выступаюць конкурсы і фестывалі. Зразумела, усё гэта патрабуе грошай, але праводзіць падобныя мерапрыемствы — неабходна. Хаця б лакальныя! Бо гэта так узнімае калектыў! І настрой адразу іншы, і жаданне займацца — падвойнае...

Яўген ЯФІМАЎ:

— Толькі ў Каўнасе за год, наколькі я ведаю, праходзяць па чатыры харавыя фестывалі.

Альбіна ПЯКУЦЬКА:

— Трэба настройваць і выпускнікоў-хормайстраў, каб не кідалі займацца акадэмічнымі спевамі. Бо сёння, пры такім уціску і папулярнасці эстрады, многія кідаюцца ў гэтую сферу, часам забываючы, што акадэмічныя спевы заўсёды былі і будуць асновай усіх асноў.

Таццяна МАРОЗАВА:

— Такая ўвага да акадэмічных спеваў — гэта яшчэ і фарміраванне будучай філарманічна-опернай публікі. Даўно заўважана: сярод тых, хто ў дзяцінстве займаўся музыкай і рабіў гэта не "з-пад палкі", а з задавальненнем (а хор дае для гэтага ўсе магчымасці: тут, прабачце, не трэба вучыць надакучлівыя гамы), куды большы працэнт заўсёднікаў сур'ёзных філарманічных канцэртаў, оперных прэм'ер.

Тамара СЛАБОДЧЫКАВА:

— У людзей ёсць жаданне спяваць. Трэба толькі падштурхнуць! Калі мы праводзілі нядаўняе спеўнае свята ў Дзень горада, да нас далучыліся нават вясельныя картэжы. І дзеці-харысты адразу адрэагавалі на гэта: пачалі спяваць маладым слаўленні. Чым не яшчэ адна добрая традыцыя? Вяселлі заўсёды суправаджаюцца музыкай. Дык чаму гэта павінна быць адно эстрада? А тыя ж "Дажынкі"! Чаму б не правесці харавое свята і для працаўнікоў сяла? Быць не можа, каб ніхто не адгукнуўся! Проста, патрэбны нейкі імпульс — і людзі заспяваюць. Была б ініцыятыва! І яе падтрымка...

Занатавала
Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота **Юрыя ІВАНОВА**

Чаму харавыя спевы менш папулярныя за сольную эстраду ці футбол?

Каментарый з нагоды

Па каментарыі мы звярнуліся ў адміністрацыю Першамайскага раёна сталіцы, які стаў ініцыятарам правядзення ўжо трох харавых святаў у Мінску, пра што згадвалі ўдзельнікі "круглага стала", і на Сталічнае тэлебачанне, дзе нядаўна быў здзейснены Міжнародны праект "ХОРоШОУ": спаборнічалі (праўда, з мікрафонамі, а часам і пад фанаграму "плюс адзін", бо надта вялікая розніца была паміж некаторымі нумарамі адных і тых жа выканаўцаў) харавыя калектывы з Беларусі, Расіі, Латвіі, Літвы, Польшчы, Украіны. Перамаглі, дарэчы, Беларусь і Літва.

Наталля КАРАЛЁВА, начальнік аддзела культуры адміністрацыі Першамайскага раёна г. Мінска:

— Я неяк была ў Рызе на харавым свяце. Уражанні — незабыўныя! Сапраўды, чаму б не праводзіць такія святы і ў нас? Са свайго боку, зазначу і тое, што харавыя спевы, як і ўсялякая калектыўная праца, — гэта яшчэ і вялікі сродак ідэалогіі, а таксама сродак выхавання чалавека ў соцыуме. І падтрымліваць гэты кірунак трэба з розных бакоў: як сіламі энтузіястаў (а без людзей апантаных увогуле ніколі нічога не здзейсніцца), так і на дзяржаўным узроўні, а таксама праз спонсараў, сродкі масавай інфармацыі. Бо тут усё ўзаемазвязана: будуць цікавыя харавыя праекты — будзе і ўвага да іх. А як будуць папулярызаваць харавыя спевы, дык і праектаў пабольшае.

Звярну ўвагу і на такі аспект. Хорам, на маю думку, павінны быць ахоплены ўсе ўзросты. А што ў нас? Ёсць калектывы, вядома, дзіцячыя, студэнцкія (я зараз — не пра вучэбныя хары, якія мае кожнае вучылішча ў галіне музыкі і, шырэй, мастацтва, а пра аматарскія "пазанавучальныя" згуртаванні). Ёсць харавыя калектывы на буйных прадпрыемствах (на тым жа заводзе Вавілава ў свой час былі ажно два хоры: акадэмічны і народны, нават юбілей завод адзначаў выступленнямі сваіх калектываў, а не запрошаных артыстаў). А куды падацца, да прыкладу, жанчыне, якая ў 55 гадоў выйшла на пенсію і вырашыла, нарэшце, рэалізаваць сябе ў творчасці, на сцэне, у святле пражэктараў? У хор ветэранаў — узрост не той. А калектываў агульнадаступных, што ядналі б людзей розных узростаў, у нас практычна няма. Можа, калі іх было б больш, дык і непаразуменняў, калі адно пакаленне "не чуе" другое, у грамадстве стала б менш. Бо хор, акрамя ўсяго, вучыць "прыслухоўвацца": не толькі на музычным узроўні, на агульначалавечым — таксама. А яшчэ — дае дадатковую энергію. Праз сустрэчу з мастацтвам чалавек лягчэй пераносіць жыццёвыя складанасці, забываецца на "невырашальнасць" нейкіх побытавых праблем, бо бачыць выйсце ў іншыя сферы — духоўныя...

Каментарый з нагоды

Павел КАРАНЕЎСКІ, намеснік генеральнага дырэктара СТБ:

— Адзін з першых сваіх тэлевізійных харавых праектаў мы прымеркавалі да навагодняга свята. Атрымаўся гэткі "Навагодні карагод" на 2012 год. Тады сабралася восем аматарскіх калектываў, дзе, сярод іншых, былі хары кандытарскай фабрыкі "Камунарка", "Белдзяржстраха", Мінскага трактарнага завода. Кожны прадставіў сваю праграму, а ўсе разам спявалі Дзяржаўны гімн Беларусі. Тая тэлепраграма атрымала шырокі розгалас, было шмат тэлефанаванняў. І мы вырашылі працягваць рабіць штосьці падобнае. Так узнік цяперашні праект "ХОРоШОУ". Вядома, падобныя мерапрыемствы патрабуюць вялікай арганізацыйнай працы і дастатковых фінансавых укладанняў. Тым больш, згаданае шоу было ўжо міжнародным, а прывезці харавыя калектывы здалёк — справа не такая простая. Тым не менш, 15 — 16 верасня ў эфір выйшаў паўфінал, а 22-га — фінал спаборніцтва. І, зноў-такі, праект настолькі ўпадабалі гледачы, што было вырашана паўтарыць гэтую праграму па канале "РТР-Беларусь".

— А што далей? Ці прадугледжваецца нейкі працяг? Іншыя тэлешоу, здараецца, здымаюцца літаральна за адзін-два дні, а выходзяць потым у эфір часткамі, ды з трывалай рэгулярнасцю: кожны тыдзень у адзін і той жа час, прычым у самы "глядзельны" — у так званы прайм-тайм...

— Мы таксама думаем пра магчымасці працягу такога спаборніцтва. Але ўсё будзе залежаць ад далейшай рэакцыі тэлегледачоў і ад наяўнасці грошай. Усё ж такі, паўтаруся, такія праекты куды больш затратныя, чым некаторыя іншыя...